яннем заходнееўрапейскага мастацтва, так і праяўленнем творчых асаблівасцей мясцовых іканапісных майстэрань.

1. Карэлін У. Р., Мельнікаў М. П. Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі // Історія релігій в Україні: наук. щоріч. Львів, 2015. Кн. 2. С. 335–350.

2. Карэлін У. Р., Мельнікаў М. П. Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі (частка 2) // Історія релігій в Україні: наук. щоріч. Львів, 2016. Ч. 2, 3. С. 486–497.

3. Карэлін У. Р., Мельнікаў М. П. Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі // Історія релігій в Україні: наук. щоріч. Львів, 2017. Ч. 2. С. 152–163.

4. Карэлін У. Р., Мельнікаў М. П. Рэдкія сюжэты ў іканаграфіі святых у храмах Беларусі // Історія релігій в Україні: наук. щоріч. Львів, 2018. Ч. 2. С. 95–115.

5. Католическая энциклопедия. Москва: Изд-во Францисканцев, 2002. Т. 1. 1906 с.

6. Католическая энциклопедия. Москва: Изд-во Францисканцев, 2005. Т. 2. 1818 с.

7. Католическая энциклопедия. Москва: Изд-во Францисканцев, 2007. Т. 3. 1910 с.

8. Католическая энциклопедия. Москва: Изд-во Францисканцев, 2011. Т. 4. 1962 с.

9. Католическая энциклопедия. Москва: Изд-во Францисканцев, 2013. Т. 5. 934 с.

10. Сорок_Севастийских_мучеников. URL: https://ru.wikipedia.org/wiki/.

11. Спиридон_Тримифунтский. URL: https://ru.wikipedia.org/wiki/.

**Галіна Флікоп-Світа**

# Скульптуры ў прысценных алтарах грэка-каталіцкіх храмаў Беларусі ў XVIII – пачатку XIX ст.: на матэрыяле захаваных помнікаў і архіўных крыніц

Дадзены артыкул прысвечаны цікавай, аднак даволі слаба распрацаванай праблеме – наяўнасці фігуратыўных скульптур у алтарах уніяцкіх храмаў. Скульптуры маглі служыць і дэкорам у навершшы, у крылах або па самім каркасе (напрыклад, выявы анёлаў, херувімаў), а маглі выступаць у ролі галоўнай выявы. У дадзеным артыкуле мы засяродзімся менавіта на тых скульптурах, якія ў алтарах былі семантычнай дамінантай і кампазіцыйным цэнтрам. Не гледзячы на дастатковае распаўсюджанне ў грэка-каталіцкіх цэрквах, скульптуры ўніяцкіх храмаў Беларусі ніколі не абіраліся аб’ектам спецыяльнага даследавання. Некаторыя помнікі былі апублікаваны ў музейных каталогах альбо спецыялізаваных выданнях, прысвечаных сакральнай скульптуры, аднак там яны былі прадстаўлены ў шэрагу помнікаў іншых канфесій. Такім чынам, мэтанакіравана алтарныя скульптуры вывучаліся.

Абыход увагай гэтага пытання абумоўлены відавочнымі прычынамі: да нашага часу захаваліся толькі адзінкавыя прысценныя ўніяцкія алтары. Яшчэ менш маецца прыкладаў, дзе ў гэтых алтарах размяшчаюцца скульптуры. Вядома, што ў 1830-ыя гг., калі адбывалася падрыхтоўка да скасавання Уніі, з цэркваў прыбіраліся ўсе атрыбуты "лацінства". Перш за ўсё гэта датычылася прысценных алтароў. У лепшым выпадку яны былі пераўтвароны ўківоты.

А фігуратыўныя скульптуры хоць і не супярэчаць правілам і канонам праваслаўнай царквы, аднак Святым Сінодам, у юрысдыкцыі якога апынуліся нашыя храмы пасля далучэння беларускіх земляў да Расійскай імперыі, іх наяўнасць у беларускіх цэрквах, трактавалася як "акаталічванне", бо практыка шырокага выкарыстання скульптур у сакральным інтэр'еры звязана перш за ўсё з каталіцкай традыцыяй. Таму верагодна, што тыя скульптуры, якія перажылі перыяд скасавання Уніі, загінулі ў другой палове XIX ст., калі працягвалі адбывацца змены ў царкоўнай сферы. Таму даследаванне заяўленай праблемы можна ажыццяўляць толькі пры прыцягненні архіўных крыніц. У артыкуле перш за ўсё будуць разгледжаны тыя выпадкі, калі галоўнае месца ў алтары адводзілася не абразу, а скульптуры.

Адзначым, што на сённяшні дзень, канешне, скульптурная спадчына грэка-каталіцкай царквы дайшла ў вельмі сціплым выглядзе. Найбольшую яе колькасць складаюць фігуркі анёлаў і херувімаў, якія з'яўляліся аздобамі не толькі алтароў, але і іканастасаў, фератронаў, але ў гэтай працы яны разглядацца не будуць. Скульптур пэўных святых захавалася не шмат, а яшчэ менш сярод іх менавіта алтарных помнікаў, якія ўяўляюць непасрэдную цікавасць для нашага даследавання.

У дадзеным артыкуле мы акурат і засяродзімся на тых творах, якія паходзяць з грэка-каталіцкіх алтароў, дзе яны выступалі не ў якасці дэкора, а займалі цэнтральнае месца. Такіх прыкладаў у параўнанні з алтарамі каталіцкіх касцёлаў, напэўна, усё ж менш. Разам з тым, на пачатак XVIII ст. такія выпадкі зафіксаваны, а ўжо ў канцы названага стагоддзя іх стала яшчэ больш. Найчасцей ў гэтых сітуацыях гаворка ішла пра "Укрыжаванне" ці пра "Хрыста Назарэя". Былі ў алтарах і іншыя скульптуры, што вядома з візітацыйных актаў. Гаворка пра іх пойдзе ніжэй, але перш за ўсё мы звернемся да захаваных помнікаў.

Так, адзіным вядомым на сённяшні дзень колішнім уніяцкім алтаром са скульптурай з'яўляецца помнік з царквы Пераўтварэння Божага в. Порплішча Докшыцкага р-на Віцебскай вобласці (*іл. 1*). Тут прадстаўлена ў цэнтры складанага рэтабля статуя "Хрыстос Назарэй". Іканаграфія "Хрыста Назарэя" вылучаецца тым, што Ісус паўстае ў статычнай позе ў поўны рост, са звязанымі вяроўкай рукамі. Дадзеная постаць ілюструе эпізод з Бібліі, калі Ісуса прывялі да Понція Пілата. Таму творы такога сюжэту пры іх апублікаванні часам фігуруюць пад назвай "Хрыстос перад Пілатам". На землях Вялікага Княства Літоўскага сярод усіх Хрысталагічных скульптур гэтая, пасля "Укрыжавання", бадай, атрымала найбольшае пашырэнне.




*Іл. 1. Скульптура “Хрыстос Назарэй” у адным з уніяцкіх алтароў у царкве Пераўтварэння в. Порплішча Докшыцкага р-на Віцебскай вобл. Фота аўтара, 2018 г.*

Тлумачэннем такой распаўсюджанасці з'яўляецца тая акалічнасць, што ў тагачасным прыгарадзе Вільні – Антокалі (цяпер частка горада Вільнюса) у касцёле Свв. Апосталаў Пятра і Паўла знаходзілася скульптура такой іканаграфіі, якая шанавалася як цудадзейная [1, с. 166–167]. Натуральна, што тут, як і ў выпадку з цудадзейнымі абразамі, з яе пачалі для шматлікіх храмаў выконвацца копіі (не толькі скульптурныя, бо вядома і пра існаванне шматлікіх жывапісных твораў, дзе была адлюстраваная цудадзейная статуя з Антокаля). Паказальна, што даволі часта пры апісанні ўніяцкіх цэркваў у візітах згадваецца менавіта "Хрыстос Антокальскі". Але гэтае назіранне правамоцна для абразоў. Пры апісанні скульптур такіх згадак мала, а часцей усё ж гаворыцца пра "Хрыста Назарэя".

Згаданы алтар з царквы Пераўтварэння ў в. Порплішча, бадай, адзіны захаваны ўніяцкі алтар са скульптурнай выявай у цэнтры кампазіцыі. Акрамя таго, гэта адзіны захаваны алтар з засовай – спецыяльным абразом, якім зачыняецца ніша са скульптурай. На засове напісана жывапіснае "Укрыжаванне". Гэта родныя творы ў гэтым алтары, бо яны тут жа знаходзіліся і ва ўніяцкія часы. Адзіная змена, якая адбылася, датычыцца аблачэння скульптуры. Так, з візітаў вядома, што на канец XVIII – пачатак XIX стст. на статуі Хрыста былі вопраткі жоўтага колеру [2, арк. 1–1 адв.].



*Іл. 2. Скульптура "Хрыстос Назарэй"; дрэва, разьба, тэмпера, пазалота; 137×43×22 см; з Мікалаеўскай царквы а.г. Азяты Жабінкаўскага р-на Брэсцкай вобл.; трэцяя чвэрць XVIII ст. НММ РБ*

Аналагічная скульптура з царквы Св. Мікалая в. Азяты (Жабінкаўскі р-н Брэсцкай вобласці) дайшла да нашага часу і захоўваецца ў НММ РБ [3, іл. 144] (*іл. 2*). Пра яе колішняе размяшчэнне ў храме можна атрымаць звесткі з візітацыйных актаў. Так, у дакументах за 1802 г. пры апісанні галоўнага алтара згадваецца скульптура на сюжэт "Хрыстос Назарэй", якая, дарэчы, хавалася за жывапіснай засовай з выявай "Каранаванне Божай Маці". Відавочна, ў архіўнай крыніцы згадваецца менавіта тая статуя, якая і дайшла да нашага часу. Пры апублікаванні скульптуры ў альбоме "Пластыка Беларусі XII–XVIII ст." яна фігуруе пад назвай "Гэта чалавек" і з датай – трэцяя чвэрць XVIII ст. [3, іл. 144]. Што датычыцца наймення, то тут ніякіх пярэчанняў няма, бо гэта адзін з варыянтаў для абазначэння дадзенай іканаграфіі. А вось дата з'яўляецца крыху спрэчнай. Так,

у візіце за 1784 г. у азяцкай царкве скульптуры яшчэ не было і ўвогуле галоўны алтар быў не такі, як у 1802 г. Па ўсёй верагоднасці, пасля 1784 г. і да праверкі 1802 г. у царкве адбыліся змены: быў усталяваны новы галоўны алтар і скульптура для яго была зроблена тады ж. У гэтым выпадку яе датай стварэння з’яўляецца канец XVIII ст. [4, арк. 27 адв.; 5, арк. 40 адв.].

Наступны прыклад уніяцкай алтарнай скульптуры такой жа іканаграфіі – помнік з в. Тэўлі Кобрынскага р-на Брэсцкай вобласці, які зараз захоўваецца ў МСБК [6, с. 174] *(іл. 3)*. У візіце за 1802 г. пры апісанні аднаго з бакавых алтароў згадваецца статуя “Хрыста Назарэя”, якая зачынялася жывапіснай засовай з выявай Св. Дзмітрыя Пакутніка [5, арк. 57 адв.]. У час папярэдняй візіты за 1784 г. скульптура яшчэ не згадвалася, а ўцэлым гэты алтар выглядаў крыху па-іншаму: так, акрамя абраза Св. Дзмітрыя, была яшчэ выява Св. Мікалая ўверсе, а ў якасці крылаў выкарыстоўваліся створкі Царскай Брамы [4, арк. 38 адв.]. Верагодна, паміж 1784 і 1802 гг. адбылася замена алтарнай канструкцыі, у якую, напэўна, быў усталяваны ранейшы абраз Св. Дзмітрыя ў якасці засовы, аднак акрамя яго з’явілася і скульптура “Хрыста Назарэя”. Такім чынам, гэты помнік можна датаваць канцом XVIII ст., тады як супрацоўнікамі МСБК час стварэння быў акрэслены больш шырока – другая палова XVIII ст. [6, с. 174].

Яшчэ адзін фігуратыўны твор такой жа іканаграфіі ў зборах МСБК паходзіць з царквы в. Сцяпанкі Жабінкаўскага р-на Брэсцкай вобласці (*іл. 4*). З апісаннямі гэтага храма нам вядомы дзве візіты – за 1757 і 1759 гг. Якраз у прамежку гэтага часу ў царкве адбыліся змены, бо на час першай з названых праверак скульптуры не ўпамінаюцца, а пры апісанні алтароў згадваюцца абразы; а ў час другой – адзначаецца наяўнасць трох алтароў са скульптурамі [7, арк. 20; 8, с. 24]. Цяжка сказаць, ці была гэтая статуя тады ў храме, бо яе даследчыкі датуюць XIX стагоддзем. Магчыма, яна была створана ў больш ранні перыяд і належыць да сярэдзіны XVIII ст.,



*Іл. 3. Скульптура “Хрыстос Назарэй”;
дрэва, разьба, паліхромія, пазалота; 98×30×25 см;
з Успенскай царквы
в. Тэўлі Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл.;
канец XVIII ст. Фота М. П. Мельнікава. МСБК*

але можа яна і праўда апынулася ў храме пазней, а ў візітах фігуруюць іншыя скульптуры. У любым выпадку гэты твор можна аднесці да ўніяцкай спадчыны, бо, несумненна, што яна не магла быць зроблена для царквы пасля скасавання Уніі. А каталіцкіх касцёлаў, адкуль яна магла быць перанесена ў царкву в. Сцяпанкі, там паблізу таксама няма. Адсюль вынікае, што гэта – грэка-каталіцкая статуя, якая, верагодна, знаходзілася ў нейкім з алтароў.

У працяг размовы пра скульптуры “Хрыста Назарэя” засяродзімся на звестках з візітаў. Найбольш ранняя вядомая нам з дакументаў такая скульптура, а ў крыніцы яна фігуруе менавіта як “Хрыстос Антокальскі”, на 1725 год знаходзілася ў бакавым алтары ў царкве Св. Яна Евангеліста в. Рэчыца Камянецкага дэканату (Камянецкі р-н Брэсцкай вобл.) [9, арк. 132–133 адв.]. Гэта сведчыць пра пашырэнне культу антокальскай святыні сярод грэка-каталіцкіх цэркваў Вялікага Княства Літоўскага, пры чым у даволі аддаленых рэгіёнах.

З іншых цікавых назіранняў адносна такіх статуй варта згадаць, што ў базыльянскай царкве Успення Багародзіцы лешчынскага кляштара на 1823 г. у галоўным алтары ў нішы за заслонай была такая статуя “славутая ласкамі”. У вышыню яна мела два локці з чвэрцю [10, с. 2–5]. На жаль, няма больш ранніх звестак пра гэты храм, якія б дазволілі прасачыць традыцыі шанавання названай скульптуры. Магчыма, наяўнасць у базыльянскай царкве цудадзейнай статуі паўплывала на распаўсюджанне скульптур “Хрыста Назарэя” сярод беларускіх грэка-каталіцкіх цэркваў. Увогуле, такія разьбяныя фігуры ў сярэдзіне XVIII – пачатку XIX ст. зафіксаваны ў храмах розных рэгіёнаў. Выключэннем з’яўляецца толькі Турава-Пінская епархія і Палескі афіцыялат Кіеўскай архіепархіі, дзе скульптур увогуле не было, не толькі такой іканаграфіі. А ў іншых афіцыялатах Кіеўскай архіепархіі, у



*Іл. 4. Скульптура “Хрыстос Назарэй”; дрэва, разьба, паліхромія; 105×37×18 см; з царквы Св. Арханёла Міхаіла в. Сцяпанкі Жабінкаўскага р-на Брэсцкай вобл.; XIX ст. Фота М. П. Мельнікава. МСБК*

Брэсцкім афіцыялаце Уладзіміра-Брэсцкай епархіі, некаторых дэканатах Полацкай архіепархіі сустракаліся такія статуі. Асноўная іх маса сканцэнтравана ў Мінскім і суседнімі з ім Вілейскім і Барысаўскім дэканатах.

Па колькасці такія скульптуры саступалі толькі “Укрыжаванню”. У музейных зборах краіны з ліку сакральных скульптур найбольшую групу акурат і складаюць “Укрыжаванні”, што тлумачыцца іх наяўнасцю ў хрысціянскіх храмах розных канфесій. Шэраг з іх паходзіць і з колішніх уніяцкіх цэркваў, аднак нельга сцвярджаць, што яны знаходзіліся там у алтарах. Так, яны маглі быць змешчаны і ў навершшы іканастаса, і займаць іншыя месцы ў храме. З гістарычных крыніцаў мы змаглі высветліць, у якіх менавіта храмах такія скульптуры знаходзіліся ў алтарах.

Мы не будзем тут пералічваць усе такія выпадкі, бо яны намі сабраны і сістэматызаваны ў адпаведнай табліцы. Адзначым толькі найбольш цікавыя з іх. Так, у галоўным алтары філіяльнай капліцы Пятра і Паўла в. Пузава (цяпер – в. Вясёлае Капыльскага р-ну Мінскай вобл.), прыпісанай да Троіцкай царквы в. Савічы Клецкага дэканату (Капыльскі р-н Мінскай вобл.) скульптура “Укрыжаванне” на 1765 г. шанавалася як цудадзейная [11], і тое ж самае пра яе адзначана і ў 1784 г. [12, арк. 39]. Магчыма, гэтая акалічнасць і паўплывала на тое, што ў гэтым рэгіёне (Клецкі і Нясвіжскі дэканаты) у канцы XVIII ст. у галоўных або бакавых алтарах сямі цэркваў (акрамя названай) былі скульптуры такой жа выявы [12, арк. 39].

Яшчэ адзін прыклад цудадзейнай скульптуры “Укрыжаванне” – з царквы Адшукання Крыжа в. Цвеціна Бабыніцкага дэканату (Мёрскі р-н Віцебскай вобл.). На 1789 г. на гэтай статуі было 242 воты! [13, арк. 131– 132]. Таксама “славутая ласкамі” статуя “Укрыжаванне” знаходзілася на 1806 і 1812 гг. у філіяльнай капліцы в. Шклянцы, прыпісанай да прыхадской царквы Свв. Пятра і Паўла в. Вітунічы Барысаўскага дэканату (Докшыцкі р-н Віцебскай вобл.) [14, арк. 13; 15, арк. 17–17 адв.].

Сярод хрысталагічных скульптур значнае пашырэнне таксама атрымалі і статуі “Хрыстос Убічаваны”. Такія фігуры знаходзіліся ў храмах Рагачоўскага, Бабруйскага, Барысаўскага дэканатаў у канцы XVIII – пачатку XIX ст. [16–20]. А ў 1820-ыя гг. такіх прыкладаў, акрамя таго, шмат было зафіксавана ў цэрквах Полацкай архіепархіі пераважна ў яе паўночнай частцы – на Віцебшчыне [21]. Цікава, што назіраюцца пэўныя лакацыі ў распаўсюджанні той ці іншай скульптурнай кампазіцыі. Так, у Мінскім афіцыялаце Кіеўскай архіепархіі надзвычай шмат было статуй “Хрыста Назарэя”, у Навагрудскім – “Укрыжаванне”, у Палескім – “Хрыстос Убічаваны”.

Акрамя згаданых сюжэтаў маецца даволі шмат выпадкаў, калі дакладна не адзначана сутнасць кампазіцыі, а толькі гаворыцца пра скульптуру “Хрыста”. Хутчэй за ўсё, тут таксама была ўвасоблена адна з пералічаных іканаграфій. Таксама маецца і некалькі прыкладаў, калі Ісус быў прадстаўлены ў адпаведнай постаці і з атрыбутамі, якія ўвасабляюць біблейскі сюжэт “Уваскрэсенне”.

Напрыклад, такая кампазіцыя знаходзілася на 1759 і 1802 гг. у галоўным алтары царквы Св. Мікалая в. Радасць Камянецкага дэканату (Камянецкі р-н Брэсцкай вобл.) [22, с. 328; 23, арк. 133]. У 1802 г. у царкве Уваскрэсення г. Камянец згаданага дэканату (Брэсцкая вобл.) таксама знаходзілася такая ж фігура. Тут яна адпавядала тытулу храма і размяшчалася ў галоўным алтары [23, арк. 9].

Акрамя разнастайных хрысталагічных скульптур, у алтарах часам асноўнае месца займалі статуі Багародзіцы або некаторых святых. Хаця, калі меркаваць па звестках з візітаў, такіх прыкладаў было не так і шмат. З іх варта згадаць скульптуру "Божая Маці Смуткуючая" з в. Кісялёўцы (Кобрынскі р-н Брэсцкай вобл.), якая на 1759 і 1784 гг. размяшчалася там у бакавым алтары [22, с. 745; 4, арк. 21]. Такая ж статуя на 1789 і 1822 гг. мелася ў адным з бакавых левых алтароў у царкве Успення мястэчка Чарэя Чарэйскага дэканату (Чашніцкі р-н Віцебскай вобл.) [13, арк. 249; 24, арк. 87 адв.]. Сіметрычна ёй у адным з правых алтароў знаходзілася скульптура Ісуса Хрыста.

Пэўнае распаўсюджанне ў грэка-каталіцкіх храмах атрымалі і статуі Апосталаў Пятра і Паўла. Такія скульптуры размяшчаліся ў некаторых іканастасах, пра што размова вялася ў адпаведным раздзеле, а таксама вядомы і выпадкі, калі яны знаходзіліся ў алтарах. Да нашага часу захавалася менавіта алтарныя статуі Св. Паўла і Св. Пятра з в. Гарадзішча Камянецкага р-ну Брэсцкай вобл. (*іл. 5*). З візітаў за 1759 і 1802 гг. гэтай царквы вынікае, што ў галоўным алтары, акрамя ікон, размяшчаліся яшчэ і фігуры Свв. Апосталаў Пятра і Паўла [22, с. 292; 23, арк. 32]. Але на 1725 г. іх яшчэ не было [9, арк. 152 адв.], ды і ўвогуле алтары тады адрозніваліся ад тых, якія былі ў храме ў другой палове XVIII – пачатку XIX ст. Гэта дазваляе выказаць думку, што скульптуры былі зроблены паміж 1725 і 1759 гг., што дае магчымасць больш дакладна вызначыць іх час стварэння. Паводле му-



*Іл. 5. Скульптура "Св. Апостал Павел"; дрэва, разьба, паліхромія; 116×47×32 см; з царквы Свв. Апосталаў Пятра і Паўла в. Гарадзішча Камянецкага р-на Брэсцкай вобл.; сярэдзіна XVIII ст. Фота М. П. Мельнікава. МСБК*

зейнай атрыбуцыі скульптуры датуюцца XVIII ст. [6, с. 158]. А з дапамогай візітаў іх перыяд стварэння можна звузіць, акрэсліўшы яго 1725–1759 гг.

Колішнім уніяцкім галоўным алтаром, дзе захаваліся скульптуры, з'яўляецца помнік у царкве Св. Мікалая а.г. Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на Брэсцкай вобласці, які знаходзіцца ў віме за іканастасам. Тут цэнтральнае месца адведзена абразу, але ў фарміраванні мастацкага вобраза ўсяго ансамбля ўдзельнічаюць скульптуры. Унізе паабапал калонаў, паміж якімі размешчаны жывапісны твор, знаходзяцца скульптуры Свв. Апосталаў Пятра і Паўла (*іл. 6, 7*). А ў верхняй частцы алтара размешчана аб'ёмная кампазіцыя з некалькіх разьбяных фігур (*іл. 8*), цэнтральная з якіх – Ян Хрысціцель (*іл. 9*). Побач з ім – фігуркі анёлаў. Парныя скульптуры анёлаў таксама выкарыстаны і для аздобы бакавых алтароў, дзе яны размешчаны ў верхняй частцы канструкцыі.



*Іл. 6. Скульптура "Св. Апостал Пётр" у галоўным алтары; дрэва, разьба; царква Св. Мікалая а.г. Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл.; пачатак XIX ст. Фота І. М. Ажашкоўскай, 2015 г.*



*Іл. 7. Скульптура "Св. Апостал Павел" у галоўным алтары; дрэва, разьба; царква Св. Мікалая а.г. Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл.; пачатак XIX ст. Фота І. М. Ажашкоўскай, 2015 г.*





*Іл. 8. Скульптурная кампазіцыя ў навершшы галоўнага алтара; дрэва, разьба; царква Св. Мікалая а.г. Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл.; пачатак XIX ст. Фота І. М. Ажашкоўскай, 2015 г.*

*Іл. 9. Скульптура "Ян Правазвеснік" у навершшы галоўнага алтар; дрэва, разьба; царква Св. Мікалая а.г. Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл.; пачатак XIX ст. Фота І. М. Ажашкоўскай, 2015 г.*

З захаваных помнікаў звяртаюць на сябе ўвагу парныя творы "Св. Ганна" і "Св. Іакім", якія паступілі ў МСБК з царквы в. Вярховічы Камянецкага р-на Брэсцкай вобласці [6, с. 164, 165] (*іл. 10, 11*). Творы датуюцца сярэдзінай XVIII ст. У апісаннях гэтага храма за 1759 і 1802 гг. скульптуры ўвогуле не згадваюцца. Пры тым што візіта 1759 г. вылучаецца падрабязнасцю. Хутчэй за ўсё, гэтыя статуі паступілі ў царкву з нейкай іншай. Праўда, у якой з суседніх цэркваў знаходзіліся такія фігуры – высветліць не ўдалося. Адзінае вядомае нам упамінанне ў візітах пра статуі "Ганны і Іакіма" датычыцца царквы Св. Мікалая в. Здзітава Кобрынскага р-на Брэскай вобласці. Там на 1784 г. такія скульптуры знаходзіліся ў галоўным алтары, дзе, дарэчы, акрамя іх, былі і

абразы [4, арк. 32 адв.]. Пра тое, што гэта тыя фігуры, якія паступілі ў МСБК з в. Вярховічы, сцвярджаць нельга, бо паміж храмамі адлегласць 170 км, а гэта даволі шмат. Разам з тым, і згадка ў візіце пра статуі “Ганны і Іакіма”, і захаваныя помнікі з такімі выявамі даюць уяўленне пра сюжэтную разнастайнасць алтарных грэка-каталіцкіх скульптур.



*Іл. 10. Скульптура “Св. Ганна”; дрэва, разьба, паліхромія; 105×45×23 см; з царквы Св. Мікалая в. Вярховічы Камянецкага р-на Брэсцкай вобл.; сярэдзіна XVIII ст. Фота М. П. Мельнікава. МСБК*



*Іл. 11. Скульптура “Св. Іакім”; дрэва, разьба, паліхромія; 105×45×23 см; з царквы Св. Мікалая в. Вярховічы Камянецкага р-на Брэсцкай вобл.; сярэдзіна XVIII ст. Фота М. П. Мельнікава. МСБК*

З царквы Аляксандра Неўскага в. Стрэльна Брэсцкай вобл. паходзіць скульптура Св. Яна Непамука, якая захоўваецца ў МСБК [26, с. 137] (*іл. 12*). Помнік датуецца XVIII ст., няма сумневу, што ён знаходзіўся ў алтары. Праўда, архіўныя крыніцы з апісаннем гэтай царквы, на жаль, нам не вядомыя. Гэтая разьбяная фігура дае ўяўленне пра скульптурнае ўвасабленне названага святога, які быў адным з найбольш шануемых у грэка-каталіцкіх храмах. З візітаў уніяцкіх цэркваў вядома, што не толькі яго абразы часта сустракаліся ў цэрквах, але і часам меліся статуі. Так, на 1784 г. у правым бакавым алтары царквы Апекі Божай Маці в. Ёдчыцы Клецкага дэканату (Клецкі р-н Мінскай вобл.) знаходзілася такая фігура [12, арк. 31]. Тое ж самае датычыцца і царквы Апекі Божай Маці м. Маладзечна Вілейскага дэканату (цяпер горад, цэнтр р-ну ў Мінскай вобл.), дзе ў адным з бакавых алтароў на 1799 і 1823 г. знаходзілася разьбяныя фігура Яна Непамука [27, арк. 140–154].

Такім чынам, з візітацыйных актаў вынікае, што найчасцей ў выглядзе статуі была вырашана постаць Ісуса Хрыста ў некалькіх сюжэтах ці варыянтах іканаграфіі. Так, пераважная большасць прыкладаў сведчыць пра тое, што ў аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі было шырока прадстаўлена "Укрыжаванне" або "Укрыжаванне з Перадстаячымі". Значнае распаўсюджанне атрымалі скульптуры "Хрыстос Назарэй", чаму садзейнічала наяўнасць такой цудадзейнай статуі ў касцёле Свв. Апосталаў Пятра і Паўла на Антокалі ў Вільні, а таксама такія скульптуры былі мясцова шануемымі і ва ўніяцкіх храмах. Сярод іншых персанажаў, у фігуратыўных творах былі прадстаўлены Свв. Апосталы Пётр і Павел, Ганна і Іакім, Ян Непамук, Дзева Марыя. Паказальна, што ў Тураўскім афіцыялаце Турава-Пінскай епархіі, які зазнаў найменшы ўплыў лацінізацыі, скульптурныя выявы не сустракаліся ўвогуле.



*Іл. 12. Скульптура "Ян Непамук"; дрэва, разьба, паліхромія; 66×24×15 см; з царквы Св. Аляксандра Неўскага в. Стрэльна Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл.; XVIII ст. Фота М. П. Мельнікава. МСБК*

Па ўсёй верагоднасці, найбольш масава скульптуры ў алтарах пачалі з’яўляцца ў другой палове XVIII ст. Хаця, зразумела, што на аснове гістарычных крыніц пра гэта складана меркаваць, бо за XVII – першую палову XVIII ст. дакументаў захавалася значна менш, чым за больш позні перыяд у гісторыі Уніі. А тым больш, раннія крыніцы не такія падрабязныя, больш павярхоўныя. Разам з тым, па некаторых рэгіёнах, дзе маюцца дакументы розных перыядаў, сапраўды заўважна, што другая палова XVIII ст., а дзесьці менавіта апошняя чвэрць гэтага стагоддзя характарызуецца больш шырокім ужываннем фігуратыўнай разьбы ў прысценных алтарах.

1. Лазука Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва: у 2 т. Мінск: Беларусь, 2007. Т. 2: XVIII – пачатак XXI стагоддзя. 351 с.: іл.

2. Vilniaus Universiteto Biblioteka. F. 5. F. 126. Sygn. 31872.

3. Пластыка Беларусі XII–XVIII стст. / аўтар і складальнік Н. Ф. Высоцкая. Мінск, 1983. 231 с.

4. Lietuvos valstybes istorijos archyvas (LVIA). F. 634. Ap. 1. B. 52.

5. LVIA. F. 634. Ap. 1. B. 56.

6. Музей старажытнабеларускай культуры: альбом / укл. А. А. Ярашэвіч. Мінск: Беларусь, 2004. 284 с.

7. LVIA. F. 634. Ap. 1. B. 50.

8. Lietuvos mokslu akademijos biblioteka (LMAB). RS. F 41. Sygn. 225-394.

9. Archiwum Państwowe w Lublinie (APL). CGKK. Sygn. 101.

10. Российский государственный исторический архив (РГИА). Ф. 824. Оп. 2. Д. 133.

11. Музей старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры. НД 1687.

12. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 3245. Воп. 7. Спр. 3.

13. APL. CGKK. Sygn. 143.

14. НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41246.

15. НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41254.

16. НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41256.

17. НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41264.

18. НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41265.

19. НГАБ. Ф. 1655. Воп. 1. Спр. 5.

20. НГАБ. Ф. 3245. Воп. 3. Спр. 65.

21. НГАБ. Ф. 1781. Воп. 26. Спр. 1410.

22. LVIA. F. 634. Ap. 1. B. 48.

23. LVIA. F. 634. Ap. 1. B. 57.

24. РГИА. Ф. 824. Оп. 2. Д. 186.

25. LVIA. F. 634. Ap. 1. B. 57.

26. Помнікі мастацкай культуры Беларусі / укл. Б. А. Лазука. Мінск: “Беларусь”, 2012. 415 с.

27. LMAB. RS. F. 41. Sygn. 107–212.